# СУЧАСНЫ МЕДЫЯЛАНДШАФТ БЕЛАРУСІ: ЗАХАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАБЫТНАСЦІ

**А. І. Чупрынскі**

*Установа адукацыі*
*«Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»,*
*пр. Незалежнасці, 81, 220012, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*cameraman@bdam.by*

Артыкул спрыяе аналітычна зразумець сучасны стан беларускага медыяландшафту, бо закранае вельмі актуальную праблему захавання нацыянальнай самабытнасці ў лічбавых сродках масавай інфармацыі, змяшчае карысныя высновы і практычныя рэкамендацыі па інфармацыйнай бяспецы Рэспублікі Беларусь.

***Ключавыя словы:*** медыяландшафт; беларуская самабытнасць; сродкі масавай інфармацыі; тактычныя медыя; нацыянальная бяспека; медыякантэнт; інфасфера.

# MODERN MEDIA LANDSCAPE OF BELARUS: PRESERVATION OF NATIONAL IDENTITY

**A. I. Chuprynski**

*Educational Institution «Belarusian State Academy of Arts»,*
*81, Nezavisimosti Av., 220012, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. I. Chuprynski (cameraman@bdam.by)*

The article helps to understand the current state of the Belarusian media landscape, as it touches on a very urgent problem of preserving national identity in digital media, contains useful conclusions and practical recommendations for information security of the Republic of Belarus.

***Key words:*** media landscape; Belarusian identity; media; tactical media; national security; media content; infosphere.

Значная гістарычная падзея ў інфармацыйнай сферы Беларусі адбылася 11 лютага 2020 года, калі кіраўнік дзяржавы правёў нараду з кіраўнікамі вядучых дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі [1, 2, 5, 6] (далей – СМІ), на якой былі разгледжаны пытанні па забеспячэнні інфармацыйнай бяспекі і пазітыўным фарміраванні іміджу краіны.

З афіцыйнай статыстыкі ў інфармацыйнай галіне Рэспублікі Беларусь, па стане на 01.05.2022 г. (крыніца http://mininform.gov.by/), колькасць рэсурсаў СМІ Беларусі наступная: друкаваныя – 1562 (з іх 427 – дзяржаўныя, 1135 – недзяржаўныя), якімі з'яўляюцца газеты, часопісы, бюлетэні, каталогі і альманахі; лічбавыя СМІ (радыё і тэлепраграмы) – 227 (з іх 147 – дзяржаўныя, 80 – недзяржаўныя); сеткавыя выданні – 37 (з іх 30 – дзяржаўныя, 7 – недзяржаўныя); інфармацыйныя агенцтвы – 7 (з іх 2 – дзяржаўныя, 5 – недзяржаўныя). Агульная колькасць інфарэсурсаў, якія зарэгістраваны ў Дзяржаўным рэестры: 1833 (з іх 606 – дзяржаўныя, 1227 – недзяржаўныя).

Па прыведзеных вышэй лічбах відавочна, што недзяржаўныя СМІ ў два разы перавышаюць колькасць дзяржаўных. Зыходзячы з вынікаў нарады кіраўніка краіны з вядучымі прадстаўнікамі дзяржаўных СМІ Беларусі, якая адбылася два гады таму, можна зрабіць высновы, што не толькі з аналітычнай кропкі гледжання навукоўцаў, але ж і звычайнаму спажыўцу сучаснай медыяпрадукцыі прыкметна наяўнасць шэрагу прабелаў па захаванні самабытных беларускіх традыцый.

Неабходна прывесці дэфеніцыю тэрміну медыяландшафт (англ. media + landscape – медыя пейзаж), які азначае сукупнасць медыйнай прасторы на пэўнай тэрыторыі той ці іншай дзяржавы свету, якая ўключае ў сябе як нацыянальныя, так і замежныя СМІ, з аддаленымі сродкамі камунікацыі. У навуковае ўжыванне паняцце ўведзена яшчэ ў 1986 годзе амерыканскім сацыёлагам і філосафам індыйскага паходжання Арджун Ападураі.

На афіцыйнай нарадзе кіраўнік дзяржавы адзначыў, што супрацьстаянне сусветнай геапалітычнай нестабільнасці патрабуе фарміравання вельмі моцнай нацыянальнай медыяструктуры, удасканалення Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь [3, 4], то бок перспектыўнае развіццё беларускага медыякантэнту не зможа ў будучым часе абыйсціся без элімінацыі знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы краіны.

Знешнія крыніцы пагроз у інфармацыйнай сферы: 1) адкрытасць і ўразлівасць інфармацыйнай прасторы Беларусі ад знешняга ўздзеяння; 2) хуткае развіццё сучасных тэхналогій маніпулявання інфармацыяй (напрыклад, fake-news альбо deepfake, ад англ. Fake – падробка), уключаючы спецтэхналогіі, накшталт – NLP (нейра-лінгвістычнае праграмаванне), якія прасоўваюцца праз лічбавыя СМІ, сацыяльныя сеткі, аднабаковую стужку навінаў у Telegram-каналах і інш. месэнджэрах; 3) распаўсюджванне ўзораў масавай антыкультуры, якая супярэчыць агульначалавечым каштоўнасцям; 4) стварэнне жахлівых навін і наўмысны псіхалагічны ціск на гледачоў

«невядомымі пагрозамі», якія могуць знянацку напалохаць большую частку насельніцтва свету і г. д.

Для выключэння гэтых негатыўных фактараў існуе шэраг паслядоўных крокаў, якія могуць дыпламатычна ўрэгуляваць сучасныя інфармацыйныя праблемы, а менавіта: матываваць этычную адказнасць вытворцаў медыяпрадукцыі; ануляваць крыніцы адмоўнага інфармацыйнага ўздзеяння; пераключаць увагу рэцыпіентаў на пазітыўныя падзеі і працэсы ў свеце; пашырана развіваць і ўкараняць медыяасвету насельніцтва краіны; своечасова абнаўляць мадэлі агульнай і стандарты вышэйшай адукацыі.

Унутраныя крыніцы пагроз у інфармацыйнай сферы: 1) распаўсюджванне недакладнай ці наўмысна скажонай інфармацыі, якая здольна нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі; 2) шэраг недахопаў у прававым рэгуляванні ў інфасферы; 3) гібрыдныя (ад лац. hibrida – помесь, мешаніна) лічбавыя СМІ, якія адначасова сумяшчаюць на адным тэлеканале дзве платформы вяшчання (беларускую і замежную); 4) неадпаведнасць мастацкай і тэхнічнай якасці беларускага медыякантэнту сусветнаму ўзроўню; 5) не ўзгодненая маркетынгавая стратэгія з праграмнай палітыкай СМІ; 6) недастатковая фінансавая падтрымка ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія прафесійна навучаюць спецыялістаў для адпаведнай галіны і г. д.

Наконт гібрыдных тэлеканалаў відавочна, што ні адна краіна свету не дапускае на сваю тэрыторыю вяшчанне вялікіх «порцый» штогадзінных «інфармацыйных укідаў» замежных навін. Значную пагрозу нацыянальнай бяспецы Беларусі ўяўляюць тактычныя медыя (англ. tactical media), якія ў выглядзе шматлікіх ранішніх, дзённых і вячэрніх инфармацыйных «стрымаў» (ад англ. stream – паток) утрымліваюць анэкалагічны, то бок негатыўны змест медыякантэнту. Штодзённы прагляд адмоўнай экраннай прадукцыі паступова прыводзіць спажыўцоў інфармацыі да змены інтэлектуальнай парадыгмы.

Значэнне культурных і нацыянальных самабытных традыцый у фарміраванні пазітыўных мадэляў камунікацыі за кошт высокатэхналагічных інавацый бясспрэчнае. Імітацыя камунікацыі ў інфармацыйных паведамленнях не павінна быць прадузятай, бо гэта можа ўвесці рэцыпіентаў да непаразумення таго, што насамрэч адбываецца. Асэнсаванне сацыяльных функцый медыяпрадукцыі заснавальнікамі і вяшчальнікамі лічбавых СМІ ў перспектыве дапаможа прызнаць гістарычную нацыянальную ідэю, незалежна ад формы ўласнасці інфармацыйных рэсурсаў.

Прыярытэтныя задачы дзяржаўнай палітыкі ў інфармацыйнай галіне наступныя: падрыхтоўка высокапрафесійнага кадравага патэнцыялу; па-

шырэнне міжнароднага супрацоўніцтва; фарміраванне эканамічна канкурэнтных і жыццяздольных механізмаў пры ўкараненні рынкавых адносін у медыясферу Беларусі; удасканаленне нарматыўна-прававой заканадаўчай базы; забеспячэнне інфармацыйнага суверэнітэту краіны.

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» у 4 артыкуле прыводзіць асноўныя прынцыпы дзейнасці СМІ Беларусі:

*Дакладнасць інфармацыі* – СМІ павінны распаўсюджваць інфармацыю, якая адпавядае сапраўднай рэчаіснасці; *законнасць* – інфармацыя не павінна супярэчыць патрабаванням заканадаўства; *роўнасць* – СМІ зыходзяць з роўнасці правоў усіх фізічных асобаў, дзяржаўных органаў, палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, юрыдычных асобаў на распаўсюджванне і атрыманне масавай інфармацыі; *павага правоў і свабод чалавека* – СМІ забяспечваюць захаванне правоў і свабод чалавека, гарантаваныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і іншымі актамі заканадаўства; *разнастайнасць думак* – СМІ забяспечваюць свабоднае выказванне і распаўсюджванне розных меркаванняў і поглядаў у грамадстве; *развіццё нацыянальнай культуры* – СМІ садзейнічаюць распаўсюджванню і папулярызацыі нацыянальных культурных каштоўнасцяў; *абарона маральнасці* – СМІ не павінны дапускаць распаўсюду інфармацыі, якая разбурае нормы грамадскай маралі; з*захаванне нормаў прафесійнай этыкі журналістаў і агульнапрынятых нормаў маралі* – журналісты СМІ ў сваёй дзейнасці павінны няўхільна выконваць нормы прафесійнай этыкі і агульнапрынятыя нормы маралі [7].

Зыходзячы з існуючых сучасных інфармацыйных пагроз для суверэнітэту нашай краіны і беларускага грамадства, варта прыняць прэвентыўныя меры па захаванні самабытнасці і ўмацаванні інфармацыйнай бяспекі Беларусі, для чаго неабходна: 1) распрацаваць дзяржаўную праграму і фінансаваць з бюджэтных крыніц агульную медыяасвету насельніцтва краіны; 2) рэгуляваць на дзяржаўным узроўні прымальныя ўмовы развіцця для прыватных інвестыцый на беларускім медыярынку; 3) паступова скараціць гібрыдныя тэлевізійныя каналы і штогод павялічваць колькасць беларускіх медыярэсурсаў; 4) ажыццяўляць своечасовае матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне вышэйшых устаноў адукацыі для падрыхтоўкі будучых спецыялістаў экранных мастацтваў і аудыёвізуальных СМІ.

Агульнасусветныя тэндэнцыі паказваюць, што медыяпрадукцыя з’яўляецца наймагутнейшым сродкам міжнароднага «ўзброенага» інфармацыйнага ўздзеяння. Замежныя медыярэсурсы і экранныя творы змяшчаюць у сабе рысы найноўшай інфармацыйнай вайны XXI стагоддзя. Праз тактычныя

медыя праводзяцца стратэгічныя **псіхалагічныя аперацыі** (амер. *psychological operations*), якія ўтрымліваюць не толькі мастацкія вобразы, метафары і сімвалы, але ж і спакваля ўкараняюць тыя ці іншыя псіхафізічныя ўстаноўкі. Навогул, праз сэнсавую трансфармацыю, закладзеную ў сучасным медыякантэнце, наўмысна ствараецца глабальная метакультура, якая можа прывесці ў далейшым да значнага паслаблення ролі нацыянальных традыцый. Востра адчуваецца таксама і недахоп высокакваліфікаваных навуковых кадраў, якія на прафесійным узроўні здольны кансультаваць, напрыклад, аўтараў сцэнарыяў, рэжысёраў, рэдактараў, дзеля перадачы гістарычна несупярэчлівых фактаў у мастацкіх ці дакументальных кінастужках, тэлевізійных праектах і праграмах.

Перспектыўнае развіццё медыяландшафту Беларусі заключаецца ў маштабным пашырэнні ўласнага ўплыву, то бок неабходна наступнае: устойліва супрацьстаяць найноўшым выклікам сучаснай інфармацыйнай вайны; усеагульна павышаць медыяасвету насельніцтва краіны праз павелічэнне вытворчасці беларускіх кінастужак, а таксама колькасці беларускіх спецыялізаваных тэлеканалаў, сеткавых і лакальных выданняў з беларускамоўным кантэнтам; штогод забяспечваць сістэму менеджменту якасці вышэйшай адукацыі ў падрыхтоўцы прафесійных кадраў на сучасным тэхнічным абсталяванні; удасканальваць жанравую разнастайнасць і драматургічны змест экраннай і тэлевізійнай прадукцыі з яскрава вылучаным беларускім самабытным каларытам як у гістарычным рэвізіянізме, так і ў інфармацыйным адлюстраванні сучасных з’яў і падзей.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Аб інфармацыйным суверэнітэце, выклікі і сумленная размова з людзьмі – Лукашэнка выказаўся пра працу дзяржСМІ. 11 лютага 2020 год, Мінск, / Кар. БелТА [Электронны рэсурс]. URL: https://www.belta.by/president/view/lukashenko-vstretilsja-s-rukovodstvom-krupnejshih-gosudarstvennyh-smi-379176-2020/ (дата звароту: 18.04.2022).
2. *Гутыра А.* Тэлебачанне, газеты, інтэрнет: якімі Лукашэнка бачыць беларускія СМІ. 11 лютага 2020 год [Электронны рэсурс]. URL: https://www.belnovosti.by/obshchestvo/televidenie-gazety-internet-kakimi-lukashenko-vidit-belorusskie-smi (дата звароту: 19.04.2020).
3. Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Пастанова Рады Бяспекі Рэспублікі Беларусь 18.03.2019. № 1 [Электронны рэсурс]. URL: http://mininform.gov.by/upload/medialibrary/6f8/6f80a36dcb2aac3bcaa330cda20ae733.pdf (дата звароту: 20.04.2022).

4. Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь: зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 575 ад 9 лістапада 2010 года. Мінск: Беларускі Дом друку, 2011. 48 с.
5. Лукашэнка сустрэўся з кіраўнікамі буйнейшых дзяржаўных СМІ /Кар. БелТА/ [Электронны рэсурс]. URL: https://www.belarus.by/ru/press-center/news/lukashenko-vstretilsja-s-rukovodstvom-krupnejshix-gosudarstvennyx-smi_i_0000108308.html (дата звароту: 21.04.2022).
6. Нарада з кіраўнікамі вядучых дзяржаўных СМІ. 11.02.2020 [Электронны рэсурс]. URL: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/soveschanie-s-rukovoditeljami-veduschix-gosudarstvennyx-smi-23018/ (дата звароту: 22.04.2022).
7. Нацыянальны прававы Інтэрнет-партал Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-З / URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=H10800427 (дата звароту: 23.04.2022).